УДК811.161.3:398.9

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДМЕТНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗАК І ПРЫМАВАК


***М. А. Садоўская*** (МДУ імя А. . Куляшова)
Нав. кіраўнік ***І. М. Ячмянева***,
кан. філ. навук, дацэнт


Вялікую каштоўнасць ў перадачы вопыту і мудрасці ва ўсе часы маюць прыказкі і прымаўкі – агульнавядомыя ўстойлівыя вобразныя выразы, кароткія выслоўі. Гэтыя адзінкі мовы больш змястоўныя і ярчэйшыя, чым багацейшая гісторыя таго народа, які іх нарадзіў. Прыказкі і прымаўкі «з'яўляюцца "залацінкамі народнай мудрасці", яны ўпрыгожваюць мову і перадаюцца з пакалення ў пакаленне як самая вялікая каштоўнасць» [1].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У сучаснай беларускай літаратурнай мове таксама «існуе цэлы пласт моўных афарызмаў, адметных сваей нацыянальна-культурнай семантыкай» [2, с.180]. Гэтыя кароткія жанры вуснай народнай творчасці найбольш ужывальныя і распаўсюджаныя.

Беларускія прыказкі, прымаўкі маюць несуменную лінгвакраіназнаўчую каштоўнасць. Найперш, яны адлюстроўваюць беларускую нацыянальную культуру як цэласныя моўныя знакі. Напрыклад, '*шэпты хату зводзяць*'(прымаўка) – '*таемныя размовы, якія вядуцца з нядобрымі намерамі, становяцца прычынай сварак і зведак*'.

Па-другое, прыказкі і прымаўкі адлюстроўваюць нацыянальную культуру Беларусі адзінкамі свайго лексіка-семантычнага і лексіка-граматычнага складу.

Вытрымаўшы ацэнку часам, яны арганічна зліліся з маўленнем, упрыгожваюць яго дасціпнасцю, здольнасцю трапна і дакладна характарызаваць усе шматлікія праяўленні жыцця.

"Прыказкі больш поўна і закончана выкладаюць усю сістэму народнай філасофіі жыцця. Можна сказаць, што прыказкі – гэта лавіна жывых пошукаў жыццевага сэнсу. Сэнс і мэта жыцця ўсведамляюцца тут як неабходныя ўмовы разумнага чалавечага існавання" [3, с.11].

**Літаратура**

1. **Садоўская, А. Л.** Менталітэт народа ў фразеалогіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https:// elib.bsu. by/ bitstream/123456789/23762/1/Садоўская% 20А.С.Частка%201-324-328.pdf. – Дата доступу : 29.01.2025

2. **Петрушэўская, Ю. А.** Моўная спецыфічнасць і нацыянальная адметнасць прыказак беларускай мовы : манаграфія / Ю. А. Петрушэўская. – Магілеў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2021. – 220 с.

3. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склаў Ф.Янкоўскі. – Мінск, Навука і тэхніка. – 1992. – 491 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова